# Нацыянальная бібліятэка рыхтуецца да пераезду

***26ліпеняўНацыянальнымпрэс-цэнтрыРэспублікіБеларусьадбыласяпрэс-канферэнцыя,прысвечанаябудаўніцтвуНацыянальнайбібліятэкіРБназавяршальнымэтапе,атаксамастварэннюнаябазерэспубліканскагаінфармацыйнагасацыякультурнагацэнгра.***

У прэс-канферэнцыі прынялі ўдзел намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь У.Грыдзюшка і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Р.Матульскі.

Тэма будаўніцтва і эксплуатацыі Нацыянальнай бібліятэкі, зазначыў Уладзімір Грыдзюшка, хвалюе ўсіх. 3 кастрычніка 2002 г. пачалося аюыўнае ўзвядзенне ў Мінску самай буйной бібліятэкі Беларусі. Была таксама створана працрўная група па распрацоўцы канцэпцыі інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра на базе Нацбібліятакі.

- Сховішча мы разглядаем як унікальны архітэктурна-будаўнічы аб'ект, - падкрхліў намеснік міністра культуры, - і як праграмна-інфармацыйны комплекс, які дазволіць забяспечыць інфармацыйныя запыпы карыстальнікаў. Распрацоўваючы комплекс інфармацыйна-тэхналагічных сістэм, канцзпцыю па стварэнні інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра, мы зыхадзілі з такога пасылу, што бібліятэка павінна быць сучаснай, што яна павінна прадсгаўляць сабой інфармацыйны, культурны, адукацыйны, навуковы цэнтр сусветнага значэння. Канцэпцыя, якая была зацверджана сёлета, ухвалена Кіраўніком дзяржавы. Інфармацыйны цэнтр складаецца з 14 падсістэм: аўгаматызаванай бібліятэчнай сістэмы; доступу і захавання; сістэмы каталогаў і інш. 3 дапамогай дадзенага комплексу будзе забяспечаны досіуп грамадзян нашай краіны да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.

Уладзімір Грыдзюшка адзначыў, шго зараз ідзе праца сумесна з Мінгарвыканкамам, заказчыкам узгадваемага аб'еюа, над мастацкім афармленнем будынка Нацыянальнай бібліятэкі: уваходнай фупы, інтар'ера і экстэр'ера. На ўваходзе наведвальнікаў новай бібліятэкі сустрэнуць два вялікія палотны, выкананыя ў форме разгорнугай кнігі. Кальцавыя калідоры на першым і другім паверхах упрыгожаць 32 карціны вядомых беларускіх мастакоў. Мяркуецца, што ў бібліятэцы будуць знаходзіцца зменныя мастацкія галерэі.

Каля ўваходу ў будынак на гранітным пасгаменце паўстане манумент Ф.Скарыне вышынёй 5,7 метра, адліты з бронзы. На ніжніх трох паверхах змесціцца ўся даведачна-інфармацыйная зона, чытальныя залы. Чытальных залаў у бібліятэцы будзе 22, яны дазволяць адначасна абслугоўваць болей за 2000 чытачоў. Нацыянальная бібліятэка ўключае кнігасховішча - уласна дыямент, якое мае 23 паверхі. Два з іх - тэхнічныя паверхі, адаін - глядзельная пляцоўка, а ўсе астатнія прызначаны для захавання 14,5 мільёна кніг. Кніжны фонд бібліятэкі штогод будзе папаўняцца на 300 тыс. экземпляраў.

Зараз поўным ходам ідзе праца над стварэннем комплексу інфармацыйна-тэхналагічных сістэм. У бібліятэцы будуць змешчаны 1,5 тыс. камп'ютэраў. 30 працэнтаў з іх пачнуць працаваць да снежня. Першы этап завершыцца да лістапада. А ў поўным аб'ёме комплекс будзе здадзены ў эксплуатацыю 1 верасня 2006 г. Хаця абслугоўваць чыпачоў бібліятэка пачне з 1 студзеня 2006 г.

Дырэюар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Раман Матульскі адзначыў:

- Асноўную ўвагу зараз надаём фармаванню элеюронных рэсурсаў, падпісцы на наступны год, каб бібліятэка магла забяспечыць карыстальнікаў не толькі айчыннымі, але і замежнымі перыядычнымі выданнямі. Будзем набываць асноўныя базы дадзеных, якія адлюстроўваюць сусветны інфармацыйны паток. Гэта зусім не значыць, што мы збіраемся супрацьставіць кніжную і электронную культуру. Гэта проста два накірункі развіцця і распаўсюджання інфармацыі, якія дапаўняюць адзін адно. Зыходзячы з дадзенага прынцыпу, будуецца наша канцэпцыя абслугоўвання карыютальнікаў у новым будынку, яна будзе накіравана як на абслугоўванне наведвальнікаў непасрэдна ў бібліятэцы, так і на арганізацыю абслугоўвання па-за яе межамі.

Сёння ў бібліятэцы ідзе праца над фарміраваннем новага штатнага раскладу. Да канца года плануецца давесці колышсць спецыялістаў да 1000 чалавек. Сюды ўвойдуць, паводле слоў Р.Матульскага, прафесіяналы, якія зоймуцца эксплуатацыяй будынка бібліятэкі, спецыялісты ў галіне камп'ютэрных сетак і сістэм, сацыякультурнай дзейнасці. 1 жніўня ў бібліятэку прыйдзе працаваць каля 90 маладых выпускнікоў ВНУ. Паводле падлікаў, у новы будынак неабходна перавезці столькі кніг, агульная вага якіх каля 2,5 тысячы тон. Даўжыня ж кніжных паліц складае прыкладна 90 кіламетраў.

У будынку Нацбібліятакі будзе створаны інтэрнэт-цэнтр, для якога выдзелена памяшканне, пракладзены неабходныя сеткі і набываецца абсталяванне. Ён адным з першых адфыецца для наведвальнікаў.

На пытанне: як будзе выкарыстоўвацца далей стары будынак бібліятэкі? - высіупоўцы адзначылі, што яго плануецца ўключыць у сістэму Нацыянальнага архіва РБ.